**L.S. Vasyukovich**
Vitebsk branch of the International University "MITSO"
e-mail vasuk.mila@tut.by

## The text of culture as a social and personal value in the school education system

*Key words: text, cultural text, school education, axiological approach, cultural representative.*

*In the article the text of culture is considered by the author as a component of the content of school education in the context of the axiological approach. Cultural texts accumulate the memory of the "eternal" values of society, design a model of modern education as a process of transmitting cultural samples, and predetermine the moral qualities of an individual.*

**Г.А. Гладкова**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: anngrin@mail.ru

УДК 371.3:821.161.3

## ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРАЎ Г. МАРЧУКА Ў ШКОЛЬНЫМ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Ключавыя словы: метадычны прыём, выхаванне, жанр, канон, мастацкі вобраз, кластар, квіз-віктарына.*

*У артыкуле разглядаюцца мастацкія творы Г. Марчука "Канон Маці", "Канон Гарыні" ў аспекце выхавання ў вучняў пачуцця любові да радзімы, павагі да сям'і і эстэтычнага ўспрымання прыроды беларускага краю. Значная ўвага надаецца інавацыйным прыёмам навучання, якія спрыяюць актывізацыі чытацкай зацікаўленасці і дапамагаюць эфектыўна ацаніць працу вучняў на ўроку.*

Сучасная метадычная навука інтэнсіўна развіваецца за кошт успрымання і адаптацыі многіх інавацыйных прыёмаў, якія часам запазычваюцца з сумежных відаў мастацтва (напрыклад, буктрэйлер узнік па аналогіі з трэйлерам відэапрадукцыі). Мадалому пакаленню чытачоў натуральна ўспрымаць мастацкі твор літаратуры праз дадатковыя прыёмы, якія спрыяюць павышэнню чытацкай зацікаўленасці, таму настаўнікі-філолагі імкнуцца актыўна выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці інавацыйныя метадычныя знаходкі. Мэта артыкула – выявіць выхаваўчы патэнцыял твораў Г. Марчука, прапанаваных для вывучэння ў 11 класе, а таксама ахарактрызаваць прымяненне інавацыйных прыёмаў павышэння чытацкай зацікаўленасці на дадзеным мастацкім матэрыяле.

Сучасная вучэбная праграма па беларускай літаратуры прадугледжвае вывучэнне твораў Г. Марчука “Канон Маці” і “Канон Гарыні” у 11 класе. На вывучэнне тэмы адведзена адна гадзіна, на працягу якой задача настаўніка – пазнаёміць вучняў з асноўнымі звесткамі пра жыццё і творчасць Георгія Марчука, на прыкладзе выбраных твораў паказаць адметнасці творчай манеры пісьменніка, паглыбіць паняцце пра апавяданне і навелу, развіваць вуснае маўленне, садзейнічаць выхаванню паважлівых адносін да малой радзімы [4, с. 72]. Асноўнымі відамі дзейнасці на ўроку прапанаваны паведамленні, аналіз твораў, праца з арыкулам вучэбнага дапаможніка, адказы на пытанні настаўніка, выкананне заданняў, гутарка па праблемных пытаннях.

Да пытанняў выкладання твораў Г. Марчука ў школе звярнулася А.І. Белая. Артыкул даследчыцы “Вывучэнне творчасці Георгія Марчука ў школе ( XI і XI’ класы)” прысвечаны падрабязнаму агляду біяграфіі пісьменніка, аналізу яго літаратурнай спадчыны [2].

Як адзначае А.І. Белая, Г. Марчука называюць “палескім песняром”. Героі твораў пісьменніка “*яскравыя, каларытная, з яркай нацыянальнай афарбоўкай*” [2, с. 27]. Нельга не пагадзіцца з даследчыцай, калі яна сцвярджае, што “*творчасць Г. Марчука скіравана на абуджэнне і выхаванне ў чалавеку любові да ўсяго жывога, здольнасці спачуваць слабаму і пакрыўджанаму, абараніць дабро перад злом*” [2, с. 27].

Выхаваўчы патэнцыял “Давыд-Гарадоцкіх канонаў” заснаваны на пісьменніцкай пільнай увазе да ўсяго таго, што звязана з малой радзімай. Назвы дзесяці канонаў аўтара акрэсліваюць прастору, якая набывае адзнакі сакральнага: “Канон Гарыні”, “Канон Хаце”, “Канон Вуліцы”, “Канон Агароду”, “Канон Школе”, “Канон Базару”. Дзяцінства, юнацтва, сталенне чалавека адбываецца ў гэтым “вечным крузе”, пачынаючыся ад Хаты і заканчваючыся дарогай ў вялікі свет. Паказальна, што “Канон Богу” і “Канон Маці” нібы абрамляюць цыкл, падкрэсліваючы два святыя паняцці для чалавека – веру у боскую сутнасць і памяць пра Маці і ўдзячнасць ёй.

Для тэкстуальнага азнаямлення школьнікам прапанаваны “Канон Гарыні” і “Канон Маці”. Аналізуючы мастацкі тэкст, вучні спыняюцца на жанравай адметнасці твораў. Варта высветліць розніцу паміж такімі жанрамі, як *апавяданне, навела, канон*. Жанр “канон” унікальны, рэдкі для сучаснай літаратуры, таму что кананічнасць тэкстаў – адзнака старажытнага прыгожага пісьменства, калі арыентацыя на канон, узор была неад’емнай асаблівасцю мастацкай манеры творцы. Кананічныя жанры жыція, слова, апокрыфа мелі пастаянную кампазіцыю, патрабавалі адпаведных мастацкіх прыёмаў ад аўтараў. Сучасная сусветная літаратура больш арыентавана на эксперымент і адвольнае абыходжанне з мастацкім словам. Эпоха постмадэрнізму засяроджана на альтэрнатыўнасці і эксперыменце, аллюзіях і яўнай ці схаванай інтэртэкстуальнасці. Аднак беларуская літаратура трывала захоўвае традыцыі, у гэтым яе адметнасць і крыніца захавання нацыянальных традыцый.

Канон у выкананні Г. Марчука суадносіцца з паняццем "вечнае", "трывалае", непадуладнае часу, тое, што было і будзе асновай жыцця чалавека. "Канон Гарыні" знаёміць чытача з аўтарскім успрыманнем ракі, якая звязана з родным Давыд-Гарадком. Спрадвеку нашы продкі выбіралі для паселішчаў берагі рэк, што было зручна для гандлю, а таксама давала магчымасць займацца рыбным промыслам. Рэчка і лес кармілі і ахоўвалі, таму невыпадкова Гарынь – рака, якая цесна звязана з жыццём землякоў Г. Марчука.

Г. Марчук – пісьменнік, які ў сваёй творчасці адлюстраваў самабытны беларускі рэгіён – Палессе. Варта папрасіць вучняў прыгадаць імёны пісьменнікаў, у творах якіх таксама месца дзеяння – палескі край. Думаецца, вучні прыгадаюць Якуба Коласа і яго аповесць "У палескай глушы", а таксама раман І. Мележа "Людзі на балоце" (згаданыя творы вывучаліся ў 10 класе). Падчас гутаркі мэтазгодна падвесці вучняў да думкі пра адметнасць палескай прыроды, самабытнасць культуры беларусаў-палешукоў, непаўторнасць нацыянальных традыцый беларускага народа.

Пры правядзенні ідэйна-тэматычнага аналізу "Канона Гарыні" можна назваць вучням факт, які іх уразіць: Беларусь багатая на паверхневыя воды, яе невыпадкова называюць сіняковкай, бо па яе тэрыторыі працякае больш за 20 тысяч рэк (!), пераважная колькасць з іх – невялікія рачулкі, аднак больш за сорак рэк маюць працягласць ад 100 да 500 кіламетраў. У якасці самастойнага задання можна прапанаваць вучням прыгадаць назвы рэк, якія звязаны з іх малой радзімай, даць апісанне, падабраць малюнкі і фотаздымкі, узгадаць легенды, звязаныя з той ці іншай ракой. Такое заданне будзе спрыяць не толькі развіццю маўлення вучняў, але яно бачыцца карысным для паглыблення ведаў краязнаўчага характару, што спрыяе станаўленню пачуцця шчырай прывязанасці да родных мясцін, развівае назіральнасць, выхоўвае ўменне бачыць прыгажосць у звычайным, тым, што заўсёды побач. Так, вучні, што нарадзіліся ў Віцебску, распавядаюць пра Віцьбу, Дзвіну і Лучосу, на берагах якіх пабудаваны горад, вучні з Полацка згадваюць пра Палоту, з Оршы – пра Оршыцу і Днепр. Такая тэма можа стаць асновай творчых праектаў для вучняў, вынікам якіх бачацца завочная экскурсія, альбом з ілюстрацыямі і каментарыем, прэзентацыя (з выкарыстаннем фотаздымкаў, карцін беларускіх мастакоў, уласных малюнкаў, лірычных твораў, відэа- і аўдыёкантэнту).

Аналізуючы мастацкі бок "Канона Гарыні", варта звярнуць увагу на мясцовыя традыцыі, звязаныя ў жыхароў Давыд-Гарадка з ракой. Апавядальная манера пісьменніка блізкая да імпрэсіяністычнай, Г. Марчук стварае адпаведны настрой у чытача, толькі штрыхамі афармляючы той ці іншы эпізод: "*Вада цёплая. Рыбак акунае ўсю кепку ў ваду і надзявае яе, мокрую, на галаву, папярэдне выкруціўшы, каб не цякло на патыліцу. Смехата. Ваду з ракі для піцця і на чай не бяруць [...]. Увечары закаханыя блізка да вады не падыходзяць... [...] Садзіцца за таполямі сонца. Вялікае чырвонае сіта. І заўтра будзе светлы цёплы дзень. Дай, Божа, яго усім*

*сустрэць. Рыбак ідзе да хаты […] Бяжыць рака, шуміць вада, нешта пяе па-свойму…”* [3].

“Канон Маці” вызначаецца адметным зместам, які грунтуецца на ўяўным дыялогу апавядальніка з памерлай маці. Сын уяўляе, якія пытанні могуць яе хваляваць. Пра што трэба папведаміць маці ў першую чаргу. Так атрымоўваецца аповед пра род, горад, жыццё. Такі мастацкі матэрыял спрыяе гутарцы пра вечныя каштоўнасці жыцця чалавека: яго сям’ю, блізкіх людзей і сяброў, пра трывалую сувязь з “родным карэннем”, той зямлёй, якая нарадзіла і пусціла ў свет. Шчымлівай тугой гучаць словы аўтара: “Мамо, не було дня, коб я не ўспамінаў цябе…” [3]. Радок не толькі перадае адметнасці дыялектнай гаворкі гарадчукоў, але эмацыянальна ўзрушвае чытача: праз усё жыццё сэрца сына захоўвае ўспамін пра маці.

Беларуская літаратура багатая на творы, дзе вобраз маці пададзены са шчырай цеплынёй і ўдзячнасцю. Думаецца, варта з вучнямі прыгадаць раман у вершах Н. Гілевіча “Родныя дзеці”, дзе раскрываецца тая ж тэма непарыўнай сувязі чалавека з роднай зямлёй і сям’ёй. Пагроза страты ў сучасным грамадстве сямейных традыцый, успрымання сям’і, як жыццёвай апоры, павінна пераадольвацца ў свядомасці вучняў прыкладамі з мастацкай літаратуры, якія павінны спалучацца з уласнымі назіраннямі і разважаннямі маладых людзей. У сувязі з гэтым, ёсць магчымасць прапанаваць вучням напісаць эсэ на тэмы “Вобраз маці ў творах беларускіх пісьменнікаў”, “Мой любімы твор пра маці”, “Роля маці ў сям’і і грамадстве: традыцыйны і сучасны погляд” і інш. Такое заданне выпрацоўвае ўменне пісьмовага маналагічнага выказвання, вучыць аргументаванаму выкладу думак, дэманструе чытацкі вопыт вучняў.

Прыём “Кластар” дзейсны на этапе аналітычнага сінтэзу атрыманых ведаў, таму мэтазгодна пасля аналізу мастацкіх твораў Г. Марчука занатаваць у сшытках прыкладны варыянт кластара:




Квіз-віктарына можа быць эфектыўным сродкам праверкі дамашняга задання (на наступным уроку) ці можа быць выкарыстана напрыканцы ўрока як этап праверкі вывучанага матэрыялу. Мэтазгодна прапанаваць вучням квіз на 5 ці 10 пытанняў (для

зручнасці пры пераводзе балаў, атрыманых за выкананне заданняў віктарыны, у школьную адзнаку).

Прыкладны варыянт пытанняў можа выглядаць наступным чынам:




Такім чынам, мастацкія творы Г. Марчука, прапанаваныя для азнаямлення на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе, становяцца прыдатным матэрыялам для выхавання ў маладога пакалення пачуцця любові да малой радзімы, фарміруюць уяўленне пра сям’ю як падмурак чалавечага жыцця, спрыяюць зацікаўленасці нацыянальным, вучаць цаніць і берагчы сувязь з роднай зямлёй.

**Літаратура**

1. Беларуская літаратура: гісторыя і сучаснасць : зборнік вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных дысцыплінах для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія / склад.: А.У. Крыклівец [і інш.]; Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Фак. філалагічны, Каф. літаратуры. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 126, [1] с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/24166 (дата доступа: 30.03.2024)
2. Белая, А.І. Вывучэнне творчасці Георгія Марчука ў школе / А.І. Белая // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 2. – С. 26-32.
3. Марчук, Г. Каноны / Г. Марчук URL: https://knihi.com/Hieorhij_Marcuk/Kanony.html (дата доступа : 30.03.2024).
4. Міхнёнак, С.С. Беларуская мова і літаратура. 11 кл. : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. прагр. агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання і выхавання / С.С. Міхнёнак, В.І. Караткевіч, І.Д. Воюш. – Мінск : НІА : Аверсэв, 2023. – 104 с.

**H.A. Hladkova**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: anngrin@mail.ru

## The educational potential of G. Marchuk's works in the school teaching of belarusian literature

*Key words: methodical technique, education, genre, canon, artistic image, cluster, quiz.*

*The article examines the artistic works of G. Marchuk "The Canon of the Mother", "The Canon of Goryn" in the aspect of educating students with a sense of love for the Motherland, respect for the family and aesthetic perception of the nature of the Belarusian territory. Considerable attention is paid to innovative teaching methods that contribute to the activation of reader interest and help to effectively evaluate the work of students in the lesson.*

**Е.Н. Горегляд, Е.В. Рылова**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: ylgoregliad@yandex.ru, katena.rylova02@gmail.com
УДК: 811.161.1'2766:70:316.752(476)

## *КРАСОТА* В СТРУКТУРЕ ЦЕННОСТНОЙ СФЕРЫ БЕЛОРУСОВ (НА МАТЕРИАЛЕ ПЕРИОДИЧЕСКОЙ ПЕЧАТИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ)

*Ключевые слова: ценность, средства массовой информации, заголовок, красота.*

*В статье рассматривается представленность ценности «красота» в русскоязычных печатных СМИ Беларуси, определяется ее роль в формировании белорусского менталитета, выявляются отличительные морфологические и синтаксические особенности лексем, маркирующих данную ценность.*

Духовная культура проникает во все сферы социальной жизни общества. Система ценностей духовной культуры складывается в процессе всей жизни и формируется посредством воспитания, усвоения традиций, через язык, литературу, общение.

Одним из наиболее влиятельных каналов формирования духовной культуры личности в современном мире является периодическая печать. Она не только отражает действительность в плане ценностей, фиксирует то, что для субъекта позитивно значимо, отвечает его миропониманию и убеждениям, но и во многом определяет ценностную ориентацию индивида [2].

Понятие «средства массовой информации» в XXI веке знакомо каждому. С точки зрения социологии, СМИ – это социальные институты,